

ЖЫВОЕ СЛОВА СУПРАЦЬ ШТУЧНАГА ІНТЭЛЕКТУ 7

МАГІЯ МУЗЫКІ ДЫРЫЖОРА АНІСІМАВА 8-9





Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

17 ЛЮТАГА 2024 г. СУБОТА № 34 (30168)


## КОРАТКА

- Органы сацабароны Мінскай вобласці ў 2023 годзе дапамаглі працаўладкавацца больш як 20 тыс. жыхароў рэгіёна.
- **«Белавія» з 3 красавіка адкрывае прамыя рэйсы з Брэста ў Маскву.**
- БУТБ разглядае магчымасць акрэдытацыі брокера ў Егіпце.
- **Больш за 56 тыс. шлюбаў зарэгістравалі ў Беларусі ў 2023 годзе.**
- Дзмітрый Гара: раскрыццё злачынстваў экстрэмісцкай накіраванасці ў мінулым годзе перавысіла 80 %.
- **Намінальная налічаная заработная плата ў 2023 годзе ў Мінскай вобласці павялічылася на 18,1 працэнта.**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Генадзь ТРУБІЛА, міністр жыллёва-камунальнай гаспадаркі:**

*«Уся работа жыллёва-камунальнай гаспадаркі краіны ў апошнія гады накіравана на вырашэнне пытанняў, якія цікавяць грамадзян, — гэта цана, якасць, аператыўнасць аказання жыллёва-камунальных паслуг. 2024 год — асаблівы. Кіраўніком дзяржавы вызначана вельмі амбіцыйная мэта — забяспечыць кантроль якасці тавараў, работ і паслуг, а таксама якасць жыцця насельніцтва на больш высокім узроўні. Для забеспячэння камфортных умоў пражывання грамадзян у актыўнай стадыі рэалізацыі знаходзіцца ўжо другая дзяржпраграма «Камфортнае жыллё і спрыяльнае асяроддзе».*

З першых вуснаў

# «СТРАЦІЦЬ ТАКУЮ ЎНІКАЛЬНУЮ СТРУКТУРУ, ЯК БЕЛКААПСАЮЗ, МЫ НЕ ПАВІННЫ, ПРОСТА НЕ МАЕМ ПРАВА»

### На агульным сходзе арганізацыі Прэзідэнт гаварыў не толькі аб гэтым

**Белкаапсаюз — сістэма, значнасць якой у эканамічным патэнцыяле краіны цяжка пераацаніць. Але дзейнасць такога буйнога прадпрыемства не можа быць абсалютна ідэальнай. Праблем у дзейнасці Белкаапсаюза больш чым дастаткова, на што неаднойчы звяртаў увагу і Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка. Кіраўнік дзяржавы неаднаразова анансаваў агульны сход прадстаўнікоў членаў Беларускага рэспубліканскага саюза спажывецкіх таварыстваў. Вызначальная і прынцыповая сустрэча прайшла ў Палацы Рэспублікі.**

Мерапрыемства пачало новую старонку ў гісторыі Белкаапсаюза. І пачалася яна з новым кіраўніком. Адкрытым галасаваннем прадстаўнікі Белкаапсаюза абралі старшынёй праўлення Інэсу Караткевіч. Да гэтага яна працавала саветнікам у Пасольстве Беларусі ў Арменіі. Раней з 2017 да 2022-га была намеснікам старшыні праўлення Белкаапсаюза. Яна выказала ўпэўненасць, што разам у 30-тысячнага калектыву Белкаапсаюза пры належнай дысцыпліне ўсё атрымаецца.



Фота БелТА.

#### «У ГОД ЯКАСЦІ МЫ НЕ МАЕМ МАРАЛЬНАГА ПРАВА РАБІЦЬ ШТОСЬЦІ АБЫ-ЯК»

Асноўныя вектары дзейнасці перад новым старшынёй праўлення і ўсім Беларускім рэспубліканскім саюзам спажывецкіх таварыстваў абазначыў асабіста Прэзідэнт. Аляксандр Лукашэнка зазначыў, што ў яго, як у Прэзідэнта, асаблівае стаўленне да гэтай арганізацыі. Ён нагадаў, што ў 90-я гады прапаноўвалася ліквідаваць Белкаапсаюз і перавесці ўсё ў прыватны гандаль. Але такія прапановы не былі падтрыманы. Белкаапсаюз у краіне захавалі.

«Так склалася гістарычна, што на тэрыторыі Беларусі вёска і спажыўкааперацыя, дапамагаючы адна адной, развіваліся разам амаль 107 гадоў. І сёння вашымі паслугамі ахоплены кожны трэці жыхар краіны. У асноўным вясковы жыхар. А я не дарэмна паўтараю: калі страцім вёску — страцім краіну. Нашы людзі, якіх мы абслугоўваем на вёсцы, вартыя самага лепшага. Працоўныя традыцыі ў вас найбагацейшыя. І досвед унікальны. І слоган ідэалагічна правільны: працаваць на карысць чалавека. У фарватары надыходзячага Года якасці мы проста не маем маральнага права рабіць штосьці абы-як. Трэба ставіць канкрэтныя мэты і дасягаць іх. Каб кожны чалавек адчуў: так, якасць і ўзровень жыцця ўзраслі», — сказаў беларускі лідар.

«Таму не крыўдуйце, але размова сёння будзе жорсткая», — папярэдзіў кіраўнік дзяржавы. Ён растлумачыў, з чым гэта звязана: «Вы, напэўна, уважліва назіраеце за Прэзідэнтам і бачыце, што я ўсё больш і больш жорстка стаўлю задачы перад адпаведнымі міністэрствамі, ведамствамі і патрабую з кадрамі. Гэта невыпадкова. Я вельмі баюся, што вы і іншыя можаце расслабіцца. Да чаго прыводзіць расслабленне — вы ведаеце», — растлумачыў ён.

#### «МЫ БУДЗЕМ ЗМАГАЦЦА ДА АПОШНЯГА ЗА НАШЫ ЗЕМЛІ»

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што сёння ўсе хочуць на Захадзе, і ў авангардзе беларускія збеглыя (у дачыненні Беларусі), паражэння Расіі ў вайне з Украінай. Ён прывёў цытату перагавораў збеглых з некаторымі асобамі на Захадзе: «Польшча мае права на заходнія землі Беларусі. А ў выпадку паражэння Расіі Беларусь будзе прырастаць за кошт заходніх зямель Расіі».

СТАР. 2-3

Адзіны дзень галасавання

# ГАТОЎНАСЦЬ НУМАР АДЗІН

### Карэспандэнт «Звязды» завітала на ўчасткі для галасавання

**Адзін з іх пад нумарам 56 знаходзіцца ў сценах магілёўскай гімназіі № 3 па вуліцы Ленінскай, гістарычнае мінулае якой звязана з вядомым вучоным, даследчыкам Поўначы і Паміра, энцыклапедыстам Ота Юльевічам Шмідтам. На ўваходных дзвярах спіс вуліц і дамоў, жыхароў якіх тут чакаюць. Асаблівасць участка ў тым, што за ім замацавана шмат студэнтаў. А яны, як вядома, маюць звычку галасаваць загадзя.**

Старшыня выбарчага ўчастка № 56, **дырэктар гімназіі Міхаіл ЯКУБУК** запрашае паглядзець залу для датэрміновага галасавання, дзе можна будзе аддаць свой голас за таго ці іншага кандыдата з 20 да 24 лютага. Яна ўжо цалкам гатовая да прыёму выбаршчыкаў. У асноўны дзень выбараў народ запросяць у больш прасторнае памяшканне. Яно таксама гатовае, напярэдадні яго даабсталююць усім неабходным.



Старшыня камісіі ўдакладняе, што для членаў каманды, якая задзейнічана ў рабоце выбарчай кампаніі, абавязкі не новыя. У гімназіі і ў ранейшыя часы размяшчаўся ўчастак для галасавання, так што алгарытм дзеянняў у цэлым вядомы і зразумелы.

СТАР. 4

Героі мірнага часу

# КРОК АСАБІСТАЙ МУЖНАСЦІ

### Сёлета спаўняецца 25 гадоў, як курсант ваеннай акадэміі Дзмітрый Гвішыяні загінуў, абараняючы іншых людзей ад пажару

**Цяпер пра гэта расказвае экспазіцыя музея ў СШ № 30 горада Брэста, якую Дзіма скончыў. У школе яго згадваюць як добрага вучня, актывіста драмгуртка, аматара спорту, а яшчэ душу кампаніі. І цалкам верагодна, што на 35-годдзе роднай школы 1 верасня гэтага года ён завітаў бы, скажам, у форме палкоўніка, каб правесці прафарыентацыйную гутарку з вучнямі і, вядома, павіншаваць любімых настаўнікаў. А бацькі Марал і Барыс Гвішыяні стаялі б побач, з унукамі, і ціха ганарыліся сынам. Верагодна... Але 1 верасня для іх сям'і цяпер — сумная дата.**



СТАР. 5

ISSN 1990 — 763X

24034

9771990763008